## Раздзел 4

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ МАГНАЦКАГА РОДУ ТЫШКЕВІЧАЎ СРОДКАМІ ВІЗУАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

УДК [069.8+069.4]Тышкевічы

**Л. У. Ландзіна,**
*доктар гістарычных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры гісторыка-культурнай спадчыны*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», Мінск*

# МЕМАРЫЯЛІЗАЦЫЯ НАВУКОВАЙ СПАДЧЫНЫ БРАТОЎ ТЫШКЕВІЧАЎ У БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ

У артыкуле аналізуюцца камемаратыўныя практыкі ў адносінах да навуковай спадчыны братоў Тышкевічаў – асветнікаў, археолагаў, заснавальнікаў беларускай музеялогіі.

**Ключавыя словы:** камемарацыя, камемаратыўныя практыкі, музеязнаўства, браты Тышкевічы.

**L. U. Landzina,**
*Doctor of Historical Studies, Associate Professor,*
*Professor of the Department of Historical and Cultural Heritage*
*of the Educational Institution “Belarusian State University*
*of Culture and Arts”, Minsk*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# MEMORIALIZATION OF THE TYSZKIEWICZ BROTHERS` SCIENTIFIC HERITAGE AT THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY OF CULTURE AND ARTS

The article analyzes the commemorative practices in relation to the scientific heritage of Konstantyn and Eustachy Tyszkiewicz brothers, who were educators, archaeologists, and the founders of Belarusian museum studies.
**Key words:** commemoration, commemoration practices, museum studies, Tyszkiewicz brothers.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На працягу апошніх дзесяцігоддзяў працэсы камемарацыі і актуалізацыі гістарычнай памяці набылі значны размах, што тлумачыцца шэрагам абставін. Пасля распаду СССР не толькі адбыўся метадалагічны пераварот у гістарычных навуках, але і атрымалі моцны імпульс нацыянальныя гістарыяграфіі былых савецкіх рэспублік. Гэты працэс часта суправаджаўся канфрантацыяй як паміж гістарычнымі школамі краін-суседзяў, так і гісторыкамі розных плыняў унутры краін. На дзяржаўным і грамадскім узроўні палітычныя рэаліі дыктавалі неабходнасць будовы нацыянальнай і дзяржаўнай ідэнтычнасці, што немагчыма без вызначэння этапаў нацыянальнай дзяржаўнасці, знакавых падзей і постацей айчыннай гісторыі, стварэння пантэона нацыянальных герояў. Менавіта ў дадзеным рэчышчы ў Беларусі абвяшчаюцца Год малой Радзімы і Год гістарычнай памяці.

У сваю чаргу, гістарыяграфічныя трансфармацыі і змена рэвалюцыйных каштоўнасцей савецкага грамадства традыцыяналісцкімі прывялі да пошуку ідэнтычнасці на ўзроўні асоб і малых груп. Гэта рэалізавалася ў складанні радаводаў, індывідуальных і сямейных генеалагічных даследаванняў, аднаўленні традыцый шляхты, дваранства, казацтва і г. д., стварэнні лакальных, карпаратыўных і сямейных гісторый і іншых мемарыяльных практыках. Камемарацыя, ці памятаванне, як публічная практыка мемарыялізацыі і візуалізацыі, выступае адным з важнейшых сродкаў стварэння гістарычнага зместу калектыўнай памяці. Калектыўная памяць, у сваю чаргу, сплачвае і ідэнтыфіцыруе сацыяльную групу. Такім чынам, камемарацыя выступае як важная мемарыяльная і ствараючая практыка, як сродак культурнай кансалідацыі і ідэнтыфікацыі, што ў сукупнасці яскрава характарызуе сучасную сацыякультурную сітуацыю.

У гэтым рэчышчы з’яўляецца важнай выснова нямецкай даследчыцы, культуролага А. Асман аб стварэнні культурнай памяці, якая «пакоіцца на такім носьбіце, яе перадаваемыя і ўзнаўляемыя аб’ектывацыі ў выглядзе сімвалаў, артэфактаў, медыятараў, практык і іх інстытуцый, у якіх індывідуумы, будучы істотамі смяротнымі, змяняюць адзін аднаго, аднак перадача і традыцыі забяспечваюць доўгатэрміновую значнасць гэтых аб’ектывацый» [1].

З пазіцый культуралогіі камемарацыя выступае як форма культурнай памяці, інтэграцыі і перадачы традыцыі. Кожная культура, адзначае нямецкі гісторык і культуролаг Асман, стварае штосьці, што можна назваць калектыўнай, ці звязваючай культурай, што аб’ядноўвае людзей у сацыяльным і часовым аспектах. Як сімвалічны «свет сэнсу», калектыўная памяць аб’ядноўвае чалавека з яго сучаснікамі, ствараючы агульную прастору вопыту і дзейнасці. Калектыўная памяць звязвае таксама «ўчора» і «сёння», фарміруючы і ўтрымліваючы ў памяці ўспаміны і досвед [2, с. 15]. Агульная памяць, падмацаваная візуалізацыяй і паўтарэннем значных для групы наратываў і сімвалаў ствараюць прыналежнасць, ці ідэнтычнасць, і даюць магчымасць асобнаму чалавеку магчымасць казаць «мы» [2, с. 15–16].

Універсітэцкая супольнасць з’яўляецца асобнай сацыяпрафесійнай групай, якая валодае калектыўнай памяццю і карпаратыўнай культурай. Дадзеная акалічнасць абавязкова вымагае рэалізацыі разнастайных камемаратыўных практык, як на ўзроўні стварэння гісторыі ўласна самога ўніверсітэта, так і на ўзроўні фарміравання пантэона асоб, якія былі знакавымі для развіцця пэўных навуковых галін.

Мемарыялізацыя навуковай спадчыны Канстанціна і Яўстаха Тышкевічаў з’яўляецца як часткай камемарацыйных практык Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, так і складаючай камемарацыйнай прасторы ўніверсітэта. Пры гэтым можна вылучыць дзве формы камемарацыі, ці, па словах А. Асман, «аб’ектывацый» калектыўнай памяці. Першая з іх – стварэнне «месца памяці», у дадзеным выпадку мемарыяльнай (ці імянной) аўдыторыі, у якасці другой выступае сістэматычнае правядзенне навуковых мемарыяльных канферэнцый, якія атрымалі назву «Тышкевіцкія чытанні».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ідэя арганізацыі мемарыяльнай аўдыторыі ўзнікла ў 2007 г., калі загадчыкам кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства (менавіта так называлася тады кафедра гісторыка-культурнай спадчыны) быў доктар культуралогіі А. І. Смолік [4; 6]. З аднаго боку, як ўзгадваў А. І. Смолік, асабіста ў яго цікавасць да братоў Тышкевічаў узнікла пасля шматгадовага вывучэння ўласнай малой радзімы – вёскі Каловічы, якая да 1939 г. уваходзіла ў склад Вілейскага павета Віленскага ваяводства. Высветлілася, што гэта месца ў Сярэдневякоўі насялялі крывічы, і адкрылі гэта даследаванні па гісторыі і археалогіі братоў Тышкевічаў і іх бацькі. Адсюль узнікла, па-першае, пытанне, чаму аб Тышкевічах амаль нікому не было вядома, і, па-другое, ідэя стварэння кафедральнай мемарыяльнай аўдыторыі. Гэта было цалкам натуральна – практыка арганізацыі імянных аўдыторый існавала, а сама дзейнасць археолагаў, этнографаў, стваральнікаў першага беларускага музея братоў Тышкевічаў ідэальна ўпісвалася ў профіль кафедры. Праект стварэння мемарыяльнай аўдыторыі ў гонар братоў Тышкевічаў падтрымала і рэктар БДУКМ Я. Д. Грыгаровіч [3].

З другога боку, як узгадваў А. А. Трусаў, ідэя стварэння мемарыяльнай аўдыторыі ўзнікла амаль адначасова і ў асяроддзі студэнтаў. У рамках выкладання дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць» А. А. Трусаў даў кожнаму студэнту заданне – прапанаваць ідэю ўласнага арыгінальнага музея, прысвечанага канкрэтнай гістарычнай асобе. На той момант у групе 150 яскравай студэнткай была Марыя Ганчарык. На некалькі гадоў старэйшая за аднагрупнікаў, яна была вельмі матываванай і адначасова крэатыўнай. Менавіта яна і выказала ідэю стварэння музея братоў Тышкевічаў як заснавальнікаў беларускага музеязнаўства. Потым да Марыі далучыліся яе таварышы, пачалося стварэнне каляровых стэндаў і абмеркаванне інтэр’ера імяннной аўдыторыі, якая павінна была называцца ў гонар Тышкевічаў. Да ідэі стварэння мемарыяльнай аўдыторыі вельмі добра ставіўся і былы загадчык кафедры прафесар А. П. Грыцкевіч [9]. Ідэя аўдыторыі ў гонар братоў Тышкевічаў была тым больш да месца, што, распавядаючы пра іх археалагічныя даследаванні, можна было б добра ўпісаць у канцэпцыю аўдыторыі і вялікую колькасць археалагічных артэфактаў, здабытых падчас раскопак А. А. Трусавым [8].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На каляровых стэндах, размешчаных у аўдыторыі 403, прысвечанай братам Тышкевічам, былі адлюстраваныя партрэты Канстанціна і Яўстаха Тышкевічаў, іх радавод, археалагічныя знаходкі з экспедыцый. Спецыяльна быў паказаны Лагойскі гісторыка-археалагічны музей – першы музей на тэрыторыі сучаснай Беларусі, адкрыты ў 1842 г., Віленскі музей старажытнасцей, археалагічныя даследаванні ў Мінскай губерніі, экспедыцыя па р. Віліі і г. д. [10].




*Мал. 1.* Стэнд, прысвечаны К. Тышкевічу.
Фота з электроннага архіва Д. В. Герасімёнка




*Мал. 2.* Стэнд, прысвечаны Віленскаму музею старажытнасцей.
Фота з электроннага архіва Д. В. Герасімёнка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асобна патрэбна сказаць аб інтэр’еры аўдыторыі. Паколькі гаворка ішла аб XIX ст., было вырашана, для большай «атмасфернасці», замяніць стандартныя сталы лаўкамі, а вокны, замест жалюзі, аздобіць фіранкамі з ламбрэкенамі. Як узгадала І. Н. Колабава, з фіранкамі была асобная і няпростая гісторыя. Патрэбна было не толькі зманціраваць карнізы, але дакладна ўсё падагнаць, развесіць і сачыць за станам фіранак, якія не проста віселі, але на спецыяльных стужках трымаліся з бакоў вакон [6].




*Мал. 3.* Стэнд, прысвечаны першаму беларускаму музею ў Лагойску. Фота з электроннага архіва Д. В. Герасімёнка

Афармленне мемарыяльнай аўдыторыі было звязана яшчэ з адной немалаважнай падзеяй, якую адзначыла А. Я. Паўлава. Гэта стварэнне герба спецыяльнасці «музеязнаўства і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» [8]. Герб спецыяльнасці, па ўсіх геральдычных канонах, мае ў аснове шчыт, зялёны колер якога, відавочна, сімвалізуе прыроду Беларусі. Абрыс мапы Беларусі – блакітны, што адсылае да эпітэта «Беларусь сінявокая». На мапе Беларусі адзначаны сілуэты славутых помнікаў беларускай архітэктуры, мапу перасякае залаты ключ ведаў, на галоўцы якога рымскімі лічбамі адзначаны год заснавання спецыяльнасці – 1994. Чырвоная лента, якая ўпрыгожвае ключ, ураўнаважваецца лагатыпам універсітэта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




*Мал. 4.* Герб спецыяльнасці 1-21 01 12
Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны.
Фота з электроннага архіва Д. В. Герасімёнка

Адкрыццё аўдыторыі адбылося вясной 2008 г. [4], а восенню 2008 г. былі праведзеныя Першыя Тышкевіцкія чытанні [11, с. 114]. Як узгадалі І. І. Бамбешка і А. М. Нароўская, чытанні праходзілі ў вялікай чытальнай зале ўніверсітэта, на іх прысутнічалі госці, у тым ліку выпускнікі кафедры, а пасля завяршэння чытанняў прысутныя сабраліся за кавай на кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства [4; 7]. Практыка Тышкевіцкіх чытанняў не прыпынялася, і зараз, у 2022 г., адбываюцца ўжо IX Тышкевіцкія чытанні.

З цягам часу ўзнікла неабходнасць не толькі аднавіць інтэр'ер аўдыторыі, але і яе канцэпцыю. Гэта праца пачалася ў 2018 г., калі кафедру ўзначальвала доктар гістарычных навук, прафесар М. А. Бяспалая [5]. Кафедра неаднаразова абмяркоўвала новы дызайн і канцэпцыю, вельмі актыўны ўдзел у гэтым прымаў Д. В. Герасімёнак, які ў тым жа годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю.

Новая аўдыторыя, названая ў гонар беларускай музеялогіі, адлюстроўвае пераемнасць пакаленняў вучоных і школу беларускага музеязнаўства, якая склалася на кафедры. Левая,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

суцэльная сцяна аўдыторыі, размяшчае партрэты лепшых выпускнікоў кафедры, якія прадстаўляюць сёння школу беларускай музеялогіі. Гэта Д. В. Герасімёнак, Т. А. Джумантаева, Я. А. Кавалёў, І. Г. Лупашка, Я. Л. Краснова і г. д. Па абодва бакі ад дошкі размешчаны шафы з археалагічнымі экспанатамі, прывезенымі з раскопак, у якіх прымаў удзел А. А. Трусаў. Тут жа размешчаны і кнігі, у тым ліку працы членаў кафедры. На супрацьлеглай сцяне размешчаны два стэнды, якія з’яўляюцца кампазіцыйным і сэнсавым цэнтрам аўдыторыі, сімвалізуючы навуковую пераемнасць XIX–XX стст. у беларускім музеязнаўстве. Адзін са стэндаў прысвечаны братам Тышкевічам, другі – доктару гістарычных навук, прафесару, загадчыку кафедры ў 1975–2006 гг. А. П. Грыцкевічу. Урачыстае адкрыццё адноўленай аўдыторыі было прымеркавана да круглага стала, які адбыўся 21 лютага 2019 г. у гонар 90-гадовага юбілея А. П. Грыцкевіча [5].



*Мал. 5.* Стэнды, прысвечаныя братам Тышкевічам і А. П. Грыцкевічу.
Фота з электроннага архіва Д. В. Герасімёнка

У лютым 2021 г. ад нас зышла загадчык кафедры, доктар гістарычных навук М. А. Бяспалая. Практычна адразу на кафедры пачалася праца па мемарыялізацыі яе памяці. Вясной 2022 г. быў распрацаваны макет стэнда, які плануецца размясціць у мемарыяльнай аўдыторыі, змяніўшы кампазіцыю двух асноўных стэндаў, прысвечаных братам Тышкевічам і А. П. Грыцкевічу. Такім чынам, плануецца стварыць своеасаблівы мема-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыяльны трыпціх, прысвечаны беларускаму музеязнаўству, дзе будзе адлюстраваная сувязь навуковых пакаленняў, першым звяном якіх была навуковая дзейнасць братоў Тышкевічаў.

Важна адзначыць, што камемарацыя і напісанне сумеснай гісторыі можа быць толькі калектыўнай справай па прычыне недасканаласці і абмежаванасці памяці асобна ўзятага чалавека. З гэтай нагоды вельмі слушна выказаўся М. Хальбвакс: «Часцей за ўсё я ўзгадваю аб чымсці таму, што да гэтага мяне падштурхоўваюць іншыя, што іх памяць дапамагае маёй памяці, а мая памяць абапіраецца на іх памяць» [12, с. 28].

З гэтай нагоды я выказваю шчырую ўдзячнасць маім калегам, дзякуючы памяці і дапамозе якіх з'явіўся гэты артыкул: Аляксандру Іванавічу Смоліку, Іванне Іванаўне Бамбешка, Дзмітрыю Васільевічу Герасімёнку, Ірыне Навумаўне Колабавай, Але Мікалаеўне Нароўскай, Алене Якаўлеўне Паўлавай, Алегу Анатольевічу Трусаву.

1. *Ассман, А.* Длинная тень прошлого. Мемориальная культура и историческая политика [Электронный ресурс] / Алейда Ассман. – Режим доступа: http://loveread.ec/read_book.php?id=47595&p=13. – Дата доступа: 06.06.2022.

2. *Ассман, Я.* Культурная память: Письмо, память о прошлом и политическая идентичность в высоких культурах древности / Ян Ассман ; пер. с нем. М. М. Сокольской. – М. : Языки славянской культуры, 2004. – 368 с. – (Studia historica).

3. Інтэрв'ю аўтара з доктарам культуралогіі, прафесарам, загадчыкам кафедры культуралогіі БДУКМ А. І. Смолікам 07.06.2022.

4. Інтэрв'ю аўтара з кандыдатам культуралогіі, дацэнтам кафедры гісторыка-культурнай спадчыны БДУКМ І. І. Бамбешка 25 и 26.04.2022.

5. Інтэрв'ю аўтара з кандыдатам культуралогіі, загадчыкам кафедры гісторыка-культурнай спадчыны БДУКМ Д. В. Герасімёнкам 26.04.2022.

6. Інтэрв'ю аўтара з кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам, дацэнтам кафедры гісторыка-культурнай спадчыны БДУКМ І. Н. Колабавай 25 и 26.04.2022.

7. Інтэрв'ю аўтара з кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам, дацэнтам кафедры гісторыка-культурнай спадчыны БДУКМ А. М. Нароўскай 26.04.2022.

8. Інтэрв'ю аўтара з кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам, дацэнтам кафедры гісторыка-культурнай спадчыны БДУКМ А. Я. Паўлавай 24.06.2022.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*9.* Інтэрв’ю аўтара з кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам, дацэнтам кафедры гісторыка-культурнай спадчыны БДУКМ А. А. Трусавым 24.06.2022.

*10. Смолік, А. І.* Граф Канстанцін Тышкевіч: вучоны, археолаг, краязнаўца: культурна-асветніцкая дзейнасць старажытнага беларускага роду / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2013. – № 8. – С. 82–86.

*11. Смолік, А. І.* Тышкевіцкія чытанні / А. І. Смолік // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2009. – № 2 (12). – С. 111–114.

*12. Хальбвакс, М.* Социальные рамки памяти / М. Хальбвакс ; пер. с фр. и вступ. статья С. Н. Зенкина. – М. : Новое издательство, 2007. – 248 с. – (А).

УДК [069.8+82.091]:361.7Тышкевічы

**А. А. Трусаў,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», Мінск*

# АДЛЮСТРАВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ БРАТОЎ ТЫШКЕВІЧАЎ У ПАДРУЧНІКАХ І ВУЧЭБНЫХ ДАПАМОЖНІКАХ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

У артыкуле аналізуецца вяртанне гістарычнай спадчыны братоў Тышкевічаў у гістарычныя энцыклапедыі, падручнікі, вучэбна-метадычныя комплексы па гісторыі Беларусі, культуралогіі, музеязнаўстве і ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

**Ключавыя словы:** музей, гісторыя, культуралогія, археалогія, этнаграфія, музеязнаўства, браты Тышкевічы.

**A. A. Trusau,**
*Candidate of Historical Studies, Associate Professor,*
*Associate Professor of the Department of Historical and*
*Cultural Heritage of the Educational Institution “Belarusian State*
*University of Culture and Arts”, Minsk*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ